# ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ ДЛЯ ШКОЛЬНІКАЎ І СТУДЭНТАЎ

БЕЛАРУСКАЯ МОВА

7

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**АСНО́ВА СЛО́ВА**, пастаянная структурная частка слова, якая выражае лексічнае значэнне і з'яўляецца адзінай для ўсіх яго формаў (*крон-(а) — крон-(ы) — крон-(ай)* і пад.).

У склад А.с. уваходзяць корань і афіксы (за выключэннем флексіі). Паводле структурных асаблівасцей адрозніваюць наступныя тыпы асновы: непадзельную [супадае з коранем: *мабільн-(ы)*, *сіроп-(ø)*, *я*] і падзельную [акрамя кораня, уключае афіксы: *на-цель-н-(ы)*, *нач-н-ік-(ø)*, *пры-лесс-ø-(е)*], простую [уключае толькі адзін корань: *кабінет-н-(ы)*, *да-хат-(ы)*, *маг-ічн-асц-(ю)*] і складаную [утвараецца двума і больш каранямі: *вагон-а-рамонт-н-(ы)*, *тр-ох-фаз-ав-(ы)*, *мов-а-зна-ўств-(а)*], неперарывістую (не падзяляецца афіксамі і інтэрфіксамі: *сезон-н-(ы)*, *бусл-ян-(я)*) і перарывістую [падзяляецца афіксамі і інтэрфіксамі: *ад-гук-ну-л-(і)-ся*, *дв-ух-бак-ов-(ы)*].

*Д.В. Дзятко.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ